# *§ 33–0. Станаўленне культуры савецкага грамадства ў 1920–1930-я гг.

КУЛЬТУРНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ
РАБФАК
САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ РЭАЛІЗМ
«ПРЭЧ НЕПІСЬМЕННАСЦЬ»
С. ЭЙЗЕНШТЭЙН
М. ГОРКІ

**Культурная рэвалюцыя** — культурныя пераўтварэнні, звязаныя з ліквідацыяй непісьменнасці, стварэннем новай савецкай школы, падрыхтоўкай кадраў «народнай інтэлігенцыі», развіццём навукі, літаратуры, мастацтва на аснове марксісцка-ленінскай ідэалогіі.

**1. Асноўныя тэндэнцыі развіцця савецкай культуры ў 1920–1930-я гг.** Грандыёзныя культурныя пераўтварэнні ў Савецкай дзяржаве 1920–1930-х гг. атрымалі назву **«культурная рэвалюцыя».**

**КУЛЬТУРНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ Ў СССР**

| Мэты | Наступствы |
|---|---|
| Зацвярджэнне марксісцкай ідэалогіі ў якасці дзяржаўнай («рэвалюцыя ў розумах») | Згортванне плюралізму меркаванняў; ідэалагічная ізаляцыя краіны |
| Ліквідацыя непісьменнасці | Дасягненне высокага ўзроўню пісьменнасці насельніцтва; увядзенне ўсеагульнай сярэдняй адукацыі |
| Фарміраванне сацыялістычнай інтэлігенцыі з рабоча-сялянскага асяроддзя | На 1941 г. — 14 млн прадстаўнікоў інтэлігенцыі |
| Стварэнне «пралетарскай культуры»; новая літаратура і мастацтва з класавых пазіцый | Афармленне афіцыйнай культуры, заснаванай на марксісцкай ідэалогіі |
| Развіццё навукі і тэхнікі | Поспехі прыродазнаўчых навук; кантроль партыі над грамадскімі навукамі |
| Пераўтварэнне побыту | Ніверліроўка ўзроўню жыцця ўсіх пластоў насельніцтва; дэмакратызацыя і спрашчэнне адзення, харчавання і інш. |

Перыяд 1920–1930-х гг. зрабіўся часам радыкальных перамен. У выніку сацыяльнай рэвалюцыі быў скасаваны падзел насельніцтва на саслоўі. Культурныя пераўтварэнні за два дзесяцігоддзі дазволілі пераадолець глыбокі цывілізацыйны разрыў ва ўзроўні і якасці жыцця дзясяткаў мільёнаў людзей. Далучэнне да культуры перастала залежаць ад сацыяльнага статусу чалавека.

Мэты барацьбы з непісьменнасцю

**2. Барацьба з непісьменнасцю.** Значнае павышэнне адукацыйнага ўзроўню насельніцтва — адно з найважнейшых дасягненняў Савецкай дзяржавы. Мэта гэтага грандыёзнага праекта заключалася ў фарміраванні паўнавартаснай асобы, што адпавядала ўяўленню бальшавікоў пра пабудову новага камуністычнага грамадства. З іншага боку, курс на індустрыялізацыю запатрабаваў павелічэння колькасці адукаваных работнікаў.

Ужо ў снежні 1919 г., нягледзячы на надзвычай напружаную абстаноўку на франтах Грамадзянскай вайны, СНК прыняў дэкрэт «Аб ліквідацыі непісьменнасці сярод насельніцтва РСФСР», у якім прадугледжвалася поўная ліквідацыя непісьменнасці савецкіх грамадзян ва ўзросце ад 8 да 50 гадоў. Перад створанай у 1920 г. Усерасійскай надзвычайнай камісіяй па ліквідацыі непісьменнасці была пастаўлена задача навучыць чытаць і пісаць усіх дарослых ва ўзросце да 35 гадоў. Па ўсёй краіне разгарнуўся масавы рух «Прэч непісьменнасць!».

## ЭТАПЫ АРГАНІЗАЦЫІ СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ

| **Пошук новых формаў арганізацыі навучання ў рамках пабудовы новай савецкай школы** | **Сінтэз традыцый дарэвалюцыйнай адукацыі з ідэямі і практычным досведам 1920-х гг.** |
|---|---|
| 1917 г. — пачатак 1930-х гг. | Пачатак 1930-х гг. — 1941 г. |

**1-ы этап**

Ужо першыя гады кампаніі па ліквідацыі непісьменнасці далі станоўчыя вынікі. Пісьменнасць насельніцтва вырасла на 12–13 % у параўнанні з дарэвалюцыйным часам. Тым не менш зрабілася зразумела, што непрадуманыя эксперыменты ў сферы адукацыі не даюць чаканых вынікаў.

**2-і этап**

У 1930 г. у гарадах і прамысловых раёнах СССР была ўведзеная абавязковая сямігадовая адукацыя з прафесійным ухілам, а ў вясковых раёнах — чатырохгадовая. Ад пачатку 1930-х гг. школа вярталася да класічнай сістэмы адукацыі: асноўнай формай арганізацыі вучэбнага працэсу зрабіўся ўрок, была ўведзена пяцібальная сістэма адзнак, экзамены, атэстаты. Быў павышаны статус настаўнікаў — павялічаны іх заробак, уведзены ільготы. Усё гэта неўзабаве дало значныя вынікі.

**Вынікі**

Напрыканцы 1930-х гг. у школах СССР вучылася больш за 30 млн дзяцей — утрая больш, чым да 1917 г. У цэлым жа напачатку 1940-х гг. звыш 80 % грамадзян краіны ва ўзросце ад 9 гадоў умелі чытаць і пісаць. Канчаткова завяршыць ліквідацыю непісьменнасці планавалася да 1 студзеня 1943 г. Выканаць гэтую задачу перашкодзіла вайна.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

1. *Разгледзьце прадстаўлены фотаздымак. Знайдзіце падабенствы і адрозненні школы 1920-х гг. ад сучаснай.*
2. *З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі даведайцеся, як быў пабудаваны працэс навучання ў СССР у 1920-х гг.*
3. *Паразважайце, чаму ў 1930-х гг. адбылося вяртанне да класічнай сістэмы адукацыі.*




*Адзіная працоўная школа. 1920-я гг.*

1920-я гг.

**3. Асноўныя кірункі ў літаратуры і мастацтве.** Літаратурны працэс і развіццё выяўленчага мастацтва ў першыя гады пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі характарызаваліся складанасцю і шматграннасцю. Існавала мноства гурткоў, творчых аб'яднанняў; паэты, пісьменнікі, мастакі тварылі ў розных стылях, абіралі разнастайныя кірункі. Да ліку найбольш уплывовых аб'яднанняў належалі ЛЕФ (Левы фронт мастацтваў), «Серапіёнавы браты», РАПП (Расійская асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў). Сярод творчых аб'яднанняў мастакоў можна вылучыць АМРР (Асацыяцыю мастакоў рэвалюцыйнай Расіі), «Чатыры мастацтвы», ТММ (Таварыства маскоўскіх мастакоў).

Творчыя аб'яднанні літаратараў і мастакоў Савецкай Расіі 1920-х гг. поўніліся рэвалюцыйнымі ідэямі, імкнуліся ўдзельнічаць у сацыяльных працэсах і адпавядаць запытам часу.



„З майго пункт погляду, найлепшым паэтычным творам будзе той, які напісаны на сацыяльны заказ Камінтэрна, мае мэтавую ўстаноўку на перамогу пралетарыяту...".

Уладзімір Маякоўскі,
паэт (1893–1930)

І паэзія, і проза, і мастацтва 1920-х гг. імкнуліся да пошуку новых формаў. Сімвалісты, футурысты, акмеісты, абстракцыяністы, кубісты, канструктывісты і г. д. адмаўляліся ад класічнай спадчыны мінулага і бачылі ў мастацтве «форму жыццебудовы», прызначаную для фарміравання новага жыццёвага асяроддзя і новага чалавека.

Сітуацыя кардынальна змянілася ў 1925 г., калі з'явілася пастанова ЦК ВКП(б) «Аб палітыцы

партыі ў галіне мастацкай літаратуры». Пастаўленая ў ёй задача фарміравання ідэйнага адзінства творчых сіл на базе пралетарскай ідэалогіі ў выніку прывяла да згортвання разнастайнасці кірункаў у літаратуры і мастацтве. Партыя заклікала таксама «ўсяляк змагацца супраць легкадумнага і паблажлівага стаўлення да старой культурнай спадчыны».

У 1934 г. быў створаны Саюз пісьменнікаў СССР (кіраўнік — Максім Горкі). Гэтая і іншыя падобныя арганізацыі розных дзеячаў мастацкай культуры спрыялі ўніфікацыі сферы культуры Савецкай краіны на аснове прынцыпу партыйнасці. Адзіным дапушчальным мастацкім метадам рабіўся **сацыялістычны рэалізм**. У адным са сваіх выступленняў таго часу Максім Горкі заявіў, што асноўным героем кніг пісьменнікі павінны абраць працу. Таксама і на палотнах савецкіх мастакоў пераважалі будоўлі сацыялізму, шчаслівае жыццё калгаснікаў і рабочых. Мастацтва мусіла быць аптымістычным, простым і зразумелым для савецкіх грамадзян.

1930-я гг.

**Сацыялістычны рэалізм** — мастацкі метад літаратуры і мастацтва, які ўяўляе сабой эстэтычнае выяўленне сацыялістычна ўсвядомленай канцэпцыі свету і чалавека.



*Смерць камісара. Мастак К. Пятроў-Водкін. 1928 г.*



*Калгаснае свята. Мастак С. Герасімаў. 1937 г.*

1. З якімі гістарычнымі падзеямі звязаныя сюжэты карцін?
2. Як паказаныя палотны ілюструюць змяненне палітыкі ў галіне культуры ў 1930-я гг.?

Характарыстыка авангардызму

**4. Савецкі авангард.** Характэрнае для авангардызму адмаўленне традыцый і пошукаў у мастацтве ранейшага часу і ў цэлым рэвалюцыйнае ўспрыманне рэчаіснасці былі сугучныя сацыяльным зрушэнням у Расіі. Таму яскравы росквіт гэтага кірунку ў мастацтве ў Савецкай дзяржаве ў 1917 — першай палове 1920-х гг. быў цалкам заканамерны.

Мастацтва авангарду было эксперыментальнае, яно арыентавалася на прадбачанне будучыні. Спасціжэнне невядомага, нават непазнавальнага, было немагчымае з дапамогай звыклай мовы. Таму прыхільнікі новага кірунку распрацавалі ўласную адметную мову, якую паэт Велімір Хлебнікаў назваў «заумью».

Якую думку перадае паэт у вершаваных радках?



И вечер темец,
И тополь земец,
И моречи
И ты, далече!..
(1921 г.)

Велімір Хлебнікаў, паэт



*Паслядоўнасць. Мастак В. Кандзінскі. 1935 г.*

Як бальшавікі вырашалі задачу стварэння новага свету, так і прадстаўнікі рускага авангарду праз адмаўленне традыцыйных метадаў і формаў намагаліся прыйсці да новых шляхоў выяўлення мастацкіх вобразаў. Першыя паслярэвалюцыйныя гады былі поўныя творчых пошукаў, эксперыментаў. Мастакі-авангардысты выкарыстоўвалі найпрасцейшыя «першаэлементы» — кропкі, лініі, плямы, — праз якія паказвалі сусвет вакол сябе ў працэсе станаўлення і развіцця.

Змяненне стаўлення ўлады да авангардызму

Аднак на мяжы 1920–1930-х гг. дзяржава перастала прымаць ідэі мастакоў-авангардыстаў. Навучальныя ўстановы, у якіх зацвярджаліся іх пады-




З дапамогай дадатковых крыніц даведайцеся, да якіх плыняў належалі пералічаныя прадстаўнікі рускага авангардызму.

ходы, былі зачыненыя, выставачная дзейнасць згорнутая.

**Змены ў паўсядзённым жыцці**

**5. Паўсядзённае жыццё і грамадскія настроі.** Побыт, баўленне вольнага часу, вонкавы выгляд пасля 1917 г. зазналі сапраўды рэвалюцыйныя змены. Прыйшоўшы да ўлады, бальшавікі змянілі каляндар, спрасцілі алфавіт, увялі новыя святы, здзейснілі рашучы наступ на Царкву. Значныя сацыяльныя наступствы мела нацыяналізацыя сродкаў вытворчасці — зямель, фабрык, банкаў. Савецкае грамадства не дзялілася на бедных і багатых. Адносіны паміж людзьмі зрабіліся больш простымі і дэмакратычнымі: замест зваротаў «спадар», «вашамосць» і да т. п. зацвердзіліся «грамадзянін», «таварыш». Упрыгажэнні і іншыя прадметы раскошы лічыліся буржуазным перажыткам. З паўсядзённага ўжытку былі выключаны парфума і касметыка.




*Літары, выдаленыя з рускага алфавіту паводле рэформы 1918 г.*

Савецкія людзі, якія нарадзіліся пасля рэвалюцыі 1917 г., маглі атрымаць незвычайныя для нашых дзён імёны (Вілен, Уладзілен, Энгелен, Мэліс, Сталій, Рэвалюта, Ленор, Акцябрына, Васмарт).

Як вы лічыце, што значыла кожнае з гэтых імён?

## Калектывізм як аснова жыцця

У грамадстве прапагандаваліся здаровы лад жыцця, заняткі фізкультурай і спортам. П'янства было абвешчана галоўным «ворагам» савецкага ладу і мела быць выкаранена. Калектыўныя інтарэсы ставіліся вышэй за асабістыя, звычайнай рэччу было ўмяшанне ў прыватнае жыццё чалавека. У першыя гады пасля рэвалюцыі сустракаліся прыклады арганізацыі камун і адмовы ад інстытута сям'і. Савецкі чалавек не бачыў сябе па-за калектывам і поспехі апошняга лічыў больш значнымі, чым індывідуальныя дасягненні.

Характэрнай з'явай у гарадах былі камунальныя кватэры, у якіх адначасова жыло некалькі сем'яў, якія займалі асобныя пакоі і супольна карысталіся «месцамі агульнага карыстання» — кухняй, ванным пакоем, прыбіральняй. Сітуацыя крыху змянілася ў 1930-х гг., калі адбылася адмова ад ідэі абагульнення побыту — разам з камунальным пачалі будаваць індывідуальнае жыллё, сям'я была абвешчана

### ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ



*Мода 1920-х гг.*



*Мода 1930-х гг.*

*Параўнайце сучасную моду і моду 1920–1930-х гг. Вызначце адрозненні ў жаночай модзе 1920-х і 1930-х гг.*

ячэйкай грамадства. Тым не менш многія гараджане працягвалі жыць у «камуналках».

Савецкія людзі сталі інакш апранацца. Калі ва ўмовах Грамадзянскай вайны значнае пашырэнне атрымала ваенная ўніформа, дык пазней набылі папулярнасць спартыўныя тэмы ў адзенні. У распрацоўцы адзення ўдзельнічалі і мастакі-авангардысты. У аснове крою касцюмаў пачалі пераважаць геаметрычныя формы, спалучэнне прамавугольных і трапецападобных дэталяў рознага колеру. Але ў 1930-я гг. адзенне ў СССР было спрошчана і стандартызавана.

Газеты і часопісы

**6. Сродкі масавай інфармацыі (СМІ).** У 1920-я гг. у БССР сфарміравалася сістэма друку, якая зрабілася важным складнікам у арганізацыі грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця.

Акрамя газет выходзілі часопісы, якія, як правіла, мелі большы аб'ём і тэматычную скіраванасць. З'явіліся грамадска-палітычныя выданні для жанчын, напрыклад, часопіс «Беларуская работніца і сялянка».

У 1921 г. Народны камісарыят асветы БССР пачаў выдаваць першы часопіс для дзяцей на беларускай мове «Зоркі» пад рэдакцыяй пісьменніка З. Бядулі. У ім друкаваліся вершы і апавяданні беларускіх пісьменнікаў, творы вуснай народнай творчасці, загадкі, песні, гульні, вершы і малюнкі чыта-



**За зоркамі** (1921 г.)

За зоркамі яснымі, дзеці,
Ідзіце вы к шчасьцю і долі,
Хоць цемра пануе на сьвеце,
Ня згубіце сьцежкі ніколі.

Міхась Чарот, паэт




*Журнал «Зоркі». 1921 г.*

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ










*1. Увесну 1924 г. пачаўся выпуск новага часопіса. Як ён называўся?*

*2. Якая яго асноўная тэма або накіраванасць? Якія выявы прысутнічаюць на вокладцы? Якія асноўныя тэмы, на ваш погляд, будуць закрануты ў часопісе?*

чоў. Часопіс адыграў важную ролю, зрабіўшыся родапачынальнікам дзіцячых беларускіх перыядычных выданняў.

Ад снежня 1924 г. да 1929 г. у Мінску выходзіў штомесячны дзіцячы часопіс «Беларускі піянер». У ім друкаваліся розныя мастацкія творы, нарысы, парады юным тэхнікам, натуралістам, піянерскія песні, гульні і заданні. На старонках часопіса публікаваліся ўсе найлепшыя дзіцячыя аўтары таго часу.

**Радыёвяшчанне**

1920-я гг. — пачатак эпохі радыё. 15 лістапада 1925 г. у 18 гадзін 30 хвілін у Мінску ўпершыню прагучалі словы: «Увага! Гаворыць Мінск!». Неўзабаве радыёстанцыя пачала вяшчанне і ў Гомелі. У другой палове 1920-х гг. у 25 раёнах рэспублікі ўсталявалі гучнагаварыцелі.

У другой палове 1920-х гг. у дамах пачалі ўсталёўваць праўдныя радыёкропкі. Радыё было платнае. Бясплатна лямпавы апарат усталёўваўся і працаваў у школах, дзіцячых дамах і ў клубах вайсковых часцей.

*Нягледзячы на складанасці паўсядзённага жыцця, савецкія людзі шчыра падтрымлівалі савецкую ўладу, якая павысіла іх сацыяльны статус, знішчыла саслоўныя прывілеі, дала доступ да адукацыі, медыцыны, культуры ў цэлым. Грамадзяне першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы былі поўныя аптымізму, энтузіязму, невысока ставілі матэрыяльны дабрабыт і імкнуліся аб'яднаць намаганні ў імя высокай мэты.*

**калі ў свеце...**

1921 г. — у Маскве адкрытая Расійская акадэмія мастацкіх навук (цяпер — Дзяржаўная акадэмія мастацкіх навук)

**на тэрыторыі Беларусі...**

1919 г. — у Віцебску Марк Шагал адкрывае Першае вышэйшае мастацкае вучылішча (цяпер — Віцебскае мастацкае вучылішча)

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Складзіце ментальную карту «Культурная рэвалюцыя ў СССР», адлюстраваўшы ў ёй сутнасць, мэты і наступствы, значэнне культурных пераўтварэнняў.
2. Ці можна лічыць ліквідацыю непісьменнасці адным з найважнейшых дасягненняў Савецкай дзяржавы? Абгрунтуйце сваю думку.
3. Як змяняліся падыходы да творчасці пісьменнікаў і мастакоў Савецкай дзяржавы на працягу 1920–1930-х гг.?
4. Як вы лічыце, чаму, нягледзячы на блізкасць ідэй бальшавікоў і прадстаўнікоў авангарду ў мастацтве, улады СССР адмовіліся ад падтрымкі апошніх?
5. Якія змены адбыліся ў паўсядзённым жыцці грамадзян СССР у 1920–1930-я гг.?
6. Растлумачце значнасць сродкаў масавай інфармацыі для грамадска-палітычнага жыцця ў 1920–1930-я гг.